**УДК 392:273.2(476.5)**

# ГІСТОРЫЯ ВЫВУЧЭННЯ СТАРАВЕРАЎ ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ[1]

***канд. гіст. навук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разгледжана гісторыя вывучэння стараверскага насельніцтва Паўночнай Беларусі. Вылучаны этапы ў даследаванні гісторыі і культуры стараверaў, ахарактарызаваны метады збору, апрацоўкі і інтэрпрэтацыі гістарычных, этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў, раскрыта значэнне даследаванняў і іх уклад у вывучэнне гісторыі і культурных традыцый стараверaў рэгіёна. У артыкуле прааналізаваны працы, якія былі апублікаваныя з XIX ст. і да нашага часу. Нягледзячы на тое, што першыя сур'ёзныя працы, дзе разглядалася гісторыя і культура стараверaў Паўночнай Беларусі, былі апублікаваны яшчэ ў сярэдзіне XIX ст., да нашага часу застаўся нераспрацаваным вялікі шэраг пытанняў. Толькі павярхоўна даследаваны працэсы засялення стараверамі паўночнабеларускіх зямель, не прасочана дынаміка колькасці насельніцтва і не выяўлены асаблівасці яго рассялення ў рэгіёне. Амаль не разгледжаны асаблівасці традыцыйнай культуры стараверaў, не даследавана яе эвалюцыя ў XX – пачатку XXI стст. Не знайшлі шырокага адлюстравання ў навуковых публікацыях пытанні сацыяльна-эканамічнага становішча стараверaў рэгіёна. Вельмі слаба вывучана гісторыя стараверскага насельніцтва другой паловы XVII – XVIII стст.*

***Ключавыя словы:*** *гістарыяграфія, гістарычная навука, староверы, Паўночная Беларусь, Беларускае Падзвінне, этналогія, народная культура, фальклор, традыцыі.*

**Уводзіны.** Старaверы пасяліліся на Беларусі яшчэ ў другой палове XVII ст. У выніку рэформы патрыярха Нікана і расколу праваслаўнай царквы значная колькасць рускіх, што не прынялі новаўвядзенні і засталіся прыхільнікамі старых абрадаў, была вымушана эміграваць у суседнія з Расіяй краіны. Адным з рэгіёнаў іх кампактнага пасялення сталі беларускія землі. Прышлае насельніцтва ў асноўным асела на паўночных і паўднёва-ўсходніх абшарах сучаснай тэрыторыі Беларусі. Самым вялікім і значным месцам пасялення стараверaў-папоўцаў (і наогул стараверaў) на Беларусі на пачатку было мястэчка Ветка і яго ваколіца. Таму асноўная ўвага даследчыкаў староверства на беларускіх землях засяроджана менавіта на вывучэнні гэтага рэгіёна. У той жа час даследаванні стараверaў, якія пражываюць у Паўночнай Беларусі, былі менш інтэнсіўнымі. Як слушна адзначыў А.А. Гарбацкі, «калі пра папоўцаў і Ветку Гомельскай вобласці яшчэ можна сустрэць у сучаснай навуковай літаратуры асобныя эпізоды гісторыі, то пра беспапоўцаў, якія пражываюць у большай ступені ў Віцебскай вобласці, інфармацыя фактычна адсутнічае» [1, с. 3]. Пры гэтым трэба адзначыць, што старaверы Паўночнай Беларусі, як і ў мінулым, так і ў сучасны перыяд, прадстаўляюць адну з самых вялікіх стараверскіх груп не толькі ў Беларусі, але і ва Усходняй Еўропе. Акрамя таго, стараабраднікі гэтага рэгіёна маюць шмат адметнасцей не толькі ў канфесійным плане (большасць з іх беспапоўцы), але і ў матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Нягледзячы на пэўны перакос даследаванняў у бок стараверaў Веткі і яе ваколіц, у гістарыяграфіі існуе значны аб'ём публікацый аб паўночнабеларускіх старaверах. У артыкуле разглядаецца гісторыя даследаванняў стараверскага насельніцтва Паўночнай Беларусі. Вылучаюцца асноўныя этапы ў вывучэнні гісторыі і культуры стараверaў, характарызуюцца працы, якія былі апублікаваны па гэтых пытаннях. Асноўная ўвага ўдзелена даследаванням, праведзеным у сярэдзіне XIX – пачатку XXI стст.

**Асноўная частка.** Доўгі час старaверы, якія пражывалі на паўночнабеларускіх землях, не з'яўляліся аб'ектам вывучэння як з боку навукоўцаў, так і з боку мясцовай адміністрацыі. Першыя спробы вывучэння стараверaў на паўночнабеларускіх землях былі ажыццёўлены толькі ў 1820-я гг. У гэты перыяд для царскай адміністрацыі асабліва актуальнымі былі дэмаграфічныя даныя аб стараабрадніках. Таму ў 1826 – 1827 гг. быў праведзены перапіс рускага насельніцтва Віленскай губерні. Сабраныя ў выніку перапісу даныя даюць інфармацыю аб колькасці стараверaў у рэгіёне, іх рассяленні, сацыяльным складзе, гаспадарчай дзейнасці [2, с. 195; 3, с. 100]. Аднак падобныя даследаванні ў першай палове XIX ст. не насілі сістэмны характар. На пэўны час даследаванні стараверскага насельніцтва з боку расійскіх улад прыпыніліся.

У першай палове XIX ст. цікавасць да беларускага краю і культуры народаў, што тут пражывалі, была абумоўлена ўплывам Рамантызму. З'явіўся цэлы шэраг даследчыкаў-аматараў, якія публікавалі матэрыялы па гісторыі і культуры краю. У гэты перыяд была надрукавана кніга пісьменніка Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» («Szlachcic Zawalnia czyli Białoruś

[1] Артыкул падрыхтаваны ў ходзе працы па тэме «Фольклорное осмысление и интерпретация истории в традиционной культуре белорусов Подвинья конца XIX – начала XXI вв.», якая выконваецца ў рамках задання 1.2.06 «Фольклорное наследие белорусов в современном славянском мире: параллели, генезис, локальные особенности» (2016 – 2020 гг.; № 20160589).

w fantastycznych opowiadaniach», 1844 – 1846) [4]. Нягледзячы на тое, што гэты твор пад уплывам эпохі мае мастацкі характар, ён утрымлівае шэраг карысных звестак, у тым ліку і аб уяўленнях беларусаў адносна «асташоў» (рускіх стравераў з Асташкаўскага павету Цвярской губерні) [4, s. 19–21, s. 29]. У 1844 г. даследчык Р. Падбярэзскі, паплечнік і сябра Я. Баршчэўскага, у часопісе «Tygodnik Petersburski» апублікаваў працу «Лісты пра Беларусь» («Listy o Białejrusi»). У артыкуле Р. Падбярэзскі прадставіў кароткую характарыстыку этнічнага складу Віцебскай губерні. Даследчык ахарактарызаваў і старавераў Полацкага, Невельскага, Дынабургскага і Рэжыцкага павета. Ён звярнуў увагу на іх адрозненні ад мясцовага насельніцтва, адзначыў што старавераў трывала захоўваюць свае традыцыі і не змешваюцца з тутэйшымі. Таксама аўтар выявіў асаблівасці ў адносінах мясцовага беларускага насельніцтва да старавераў з расійскіх губерняў – «асташоў» і «булынёў» (скупшчыкаў буйной рагатай жывёлы) [5, s. 472; 6, s. 483].

**Даследаванні другой паловы XIX – пачатку XX стст.** Пачынаючы з сярэдзіны XIX ст. даследаванне старавераў на беларускіх землях адбываецца больш інтэнсіўна. Цікавасць да гэтай этнаканфесійнай групы тлумачылася яе ўзаемаадносінамі з праваслаўнай царквой і органамі дзяржаўнага кіраўніцтва. Таму ў гэты перыяд вывучэнне старавераў, як правіла, ініцыявалася праваслаўнай царквой і Міністэрствам унутраных спраў Расійскай імперыі. Колькасць даследаванняў у гэты час значна павялічылася, але толькі некаторыя з іх мелі дачыненне да беларускіх зямель. Адным з першых такіх выданняў стаў «Ваенна-статыстычны агляд» Віцебскай губерні (1852) [7]. Кніга была напісана на аснове матэрыялаў, якія сабраў генерал-маёр М.В. Без-Карніловіч. У яе трэцім раздзеле «Жыхары» коратка апісаны заняткі, побыт і маральныя рысы рускіх старавераў [7, с. 149]. У 1855 г. апублікавана іншая праца М.В. Без-Карніловіча «Гістарычныя звесткі аб знамянальных месцах у Беларусіі» [8]. Пад назвай «Беларусія» аўтар разумеў Віцебскую і Магілёўскую губерні. У кнізе М.В. Без-Карніловіч змясціў кароткую этнаграфічную характарыстыку краю. Старавeрам была прысвечана асобная глава («Расіяне»). У ёй разгледжана гісторыя стараабраднікаў на беларускіх землях (у першую чаргу, гісторыя веткаўскіх слабод) і коратка ахарактарызаваны іх побыт [8, с. 237–240]. Што тычыцца старавераў Віцебшчыны, то аўтар прывёў абсалютна тую ж інфармацыю, што была змешчана ў папярэднім яго выданні.

Важная роля ў вывучэнні старавераў Расійскай імперыі належыць А.Р. Вішнякову. Працуючы з 1862 г. у Міністэрстве ўнутраных спраў па пытаннях старавераў («раскольнікаў»), А.Р. Вішнякоў падрыхтаваў шэраг даследаванняў па гісторыі і культуры старавераў. Так, у 1865 г. у «Весніку Заходняй Расіі» быў апублікаваны яго нарыс «Раскол у заходне-рускім краі» (пад псеўданімам А. Вескінскі) [9], які ў большай ступені быў прысвечаны старавeрам беларускіх зямель. У артыкуле прыведзены статыстычныя даныя аб колькасці старавераў і іх культавых пабудоў у заходніх губернях Расіі, ахарактарызаваны асаблівасці рассялення, здзейснена спроба прасачыць гісторыю стараабраднікаў на гэтых землях, разгледжана царкоўная арганізацыя (як папоўцаў, так і беспапоўцаў), апісаны шлюбныя традыцыі, ахарактарызавана стаўленне афіцыйных улад да «раскола». Шмат матэрыялаў у працы тычыцца менавіта старавераў паўночнабеларускіх зямель.

Сярод даследаванняў сярэдзіны XIX ст. аб старавeрах на беларускіх землях асабліва вылучаецца праца настаяцеля Віцебскага кафедральнага сабора, протаіерэя В. Волкава «Звесткі пра пачатак, распаўсюджанне і раздзяленне расколу і аб расколе ў Віцебскай губерні» (1866) [10]. Нягледзячы на тое, што праца была падрыхтавана праваслаўным святаром і не пазбаўлена суб'ектыўнасці, яна змяшчае шмат каштоўных звестак па гісторыі і культуры старавераў Віцебшчыны. Праца складаецца з двух частак. У першай частцы аўтар даў агульную характарыстыку стараверству як рэлігійнаму руху, разгледзеў яго накірункі і плыні. Другая частка працы выдзелена ў асобную главу «Аб расколе ў Віцебскай губерніі» [10, с. 47–85] і прысвечана ўласна віцебскім старавeрам. Як вынікае з прыведзеных звестак, асновай для працы сталі пісьмовыя крыніцы, сведчанні старажылаў-старавераў, а таксама раней апублікаваныя даследаванні па стараверству ў Расійскай імперыі. Геаграфічна даследаванне ахоплівае ўсю Віцебскую губерню, але асноўная ўвага звернута на старавераў г. Віцебска і бліжэйшай акругі. У працы ахарактарызаваны асаблівасці і гісторыя рассялення розных староверскіх сагласаў на тэрыторыі Віцебскай губерні. Для вырашэння апошняй задачы В. Волкаў у асноўным выкарыстаў успаміны старавераў сталага ўзросту, даставернасць якіх выклікае пытанні. Значную ўвагу аўтар удзяліў апісанню рэлігійнага жыцця (ахарактарызаваў святароў папоўцаў і духоўных настаўнікаў беспапоўцаў, староверскія кнігі, рэлігійные таемствы). Асобна аўтар звярнуў увагу на тэндэнцыі да разбурэння традыцыйнага ўклада і культуры (распаўсюджанне сярод віцебскіх беспапоўцаў «наважонаў», ігнараванне традыцыйных забарон на паленне тытуню і ўжыванне алкаголю, шырокія запазычанні з беларускай і польскай моў, паступовае знікненне традыцыйнага староверскага касцюма, распаўсюджанне нават сярод жаночага насельніцтва адукацыі і еўрапейскіх узораў выхавання).

Інтарэс да культуры старавераў быў абумоўлены яе спецыфікай, якая выразна адрознівала іх ад мясцовага насельніцтва. На Віцебшчыне з першай паловы 1860-х гг. разгарнуў дзейнасць па вывучэнні гісторыі, этнаграфіі і статыстыкі А.М. Семянтоўскі. Асноўнай этнаграфічнай працай гэтага аўтара з'яўляецца «Этнаграфічны агляд Віцебскай губерні» (1872) [11]. У ёй, апроч мясцовага беларускага на-

сельніцтва, А.М. Семянтоўскі разгледзеў і тыя этнічныя групы, што кампактна пражывалі на Віцебшчыне. Раздзел «Вялікарусы» даследчык у асноўным прысвяціў апісанню стараавераў, якія складалі большасць рускага насельніцтва краю. Навуковец спыніўся на гісторыі з'яўлення іх у рэгіёне, прывёў статыстычныя даныя аб колькасці стараабраднікаў у губерні, ахарактарызаваў іх гаспадарчыя заняткі, звярнуў увагу на антрапалагічныя асаблівасці, адзенне і жыллё. Даследчык адзначыў некаторыя пазітыўныя рысы характару прыхільнікаў старога абраду (прадпрымальнасць, працавітасць, знаходлівасць), але ў той жа час у маральных адносінах ахарактарызаваў старавераў даволі негатыўна [11, с. 20]. Што тычыцца гістарычных звестак аб з'яўленні старавераў на Віцебшчыне, аналізу прычын іх пасялення на гэтым месцы, то А.М. Семянтоўскі паўтарае многія даныя, змешчаныя ў працы В. Волкава [10].

Каштоўныя матэрыялы для даследавання побыту і культуры стараабраднікаў Віцебшчыны былі апублікаваны ў III томе «Жывапіснай Расіі» (1882). Так, даследчык А.Г. Кіркор прывёў даныя аб колькасці старавераў на беларускіх землях, коратка разгледзеў гісторыю іх пасялення, ахарактарызаваў маральныя рысы староверскага насельніцтва [12, с. 284]. Пры характарыстыцы старавераў А.Г. Кіркор спасылаўся на працу А.М. Семянтоўскага [11]. Даследчык С.В. Максімаў прадставіў кароткую інфармацыю аб колькасці старавераў у Віцебскай губерні, ахарактарызаваў геаграфію іх рассялення, гаспадарчыя заняткі, а таксама адносіны з беларускім насельніцтвам [13, с. 457].

Значны аб'ём даных аб старaверах Паўночнай Беларусі быў апублікаваны ў штогадовых «Аглядах» і «Памятных кніжках» Віцебскай, Віленскай і Ковенскай губерняў. У «Аглядах», акрамя статыстычных матэрыялаў, утрымліваюцца і звесткі адносна рассялення старавераў, іх заняткаў, а таксама інфармацыя, што тычыцца спецыфікі ўзаемадзеяння з праваслаўнай царквой, дзяржаўнымі органамі і мясцовым насельніцтвам. «Памятныя кніжкі», якія таксама ўтрымліваюць значны аб'ём статыстычных даных, змяшчаюць яшчэ і шэраг артыкулаў. Так, у «Памятнай кніжцы Ковенскай губерні» за 1863 г. апублікаваны артыкул П.І. Карэцкага «Аб раскольніках у Ковенскай губерні» [14]. У працы разгледжана староверскае насельніцтва губерні, у т.л. і Новааляксандраўскага павета, у склад якога ўваходзілі тэрыторыі сучаснага Браслаўскага раёна. Артыкул змяшчае статыстычныя даныя аб колькасці старавераў ва ўсіх населеных пунктах губерні. Дадзена характарыстыка маральных рысаў стараабраднікаў, іх адносін да іншаверцаў, праваслаўнай царквы і ўлады. Таксама прыведзены звесткі аб распаўсюджанні сярод старавераў друкаваных і рукапісных кніг, узроўню іх адукацыі, дадзена кароткае апісанне гаспадарчых заняткаў старавераў, іх адзення і знешняга выгляду. У «Памятнай кніжцы Віцебскай губерні» за 1885 г. быў надрукаваны артыкул «Аб расколе ў Віцебскай губерні» [15]. Аснову публікацыі склаў скарочаны варыянт вышэй разгледжанай працы В. Волкава [10].

Матэрыялы па традыцыйнай культуры стараабраднікаў Беларускага Падзвіння былі апублікаваны ў кнізе «Віцебская губерня: Гістарычна-геаграфічны і статыстычны агляд» (1890) [16]. Інфармацыя аб старaверах губерні была змешчана ў раздзеле «Насельніцтва губерні». У асноўным, раздзел ўяўляе пераказ адпаведнай часткі працы А.М. Семянтоўскага «Этнаграфічны агляд Віцебскай губерні» [11]. Каштоўным з'яўляецца прыведзенае апісанне вясельнага абраду старавераў-беспапоўцаў Віцебскай губерні.

Характарыстыка побыту і культуры старавераў, што належыць М. Доўнар-Запольскаму і Д. Шэндэрыку, змяшчаецца ў главе «Размеркаванне насельніцтва Верхняга Падняпроўя і Беларусі на тэрыторыі, яго этнаграфічны склад, побыт і культура» кнігі «Расія. Поўнае геаграфічнае апісанне нашай Айчыны. IX том. Верхняе Падняпроўе і Беларусь» (1905) [17]. У выданні дадзена кароткая характарыстыка рассялення старавераў на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў, гаспадарчых заняткаў, прадстаўлена апісанне побыту, жылля і сядзібы, традыцыйнай кухні, адзення, ахарактарызаваны сямейныя адносіны і вясельныя традыцыі, а таксама пазначаны асаблівасці ўзаемадзеяння з мясцовым беларускім насельніцтвам. Неабходна адзначыць, што глава напісана на аснове ўжо раней апублікованых прац і ўтрымлівае няшмат новых звестак. У ёй прыведзены даныя з працы А.М. Семянтоўскага «Этнаграфічны агляд Віцебскай губерні» [11] і кнігі «Віцебская губерня: Гістарычна-геаграфічны і статыстычны агляд» [16].

Шэраг матэрыялаў па гісторыі і культуры старавераў Падзвіння быў апублікаваны ў абагульняючых даследаваннях канца XIX – пачатку XX ст., што былі прысвечаны канкрэтнаму населенаму пункту ці павету. Так, інфармацыя па вясельнай абраднасці, святах і гаспадарчай дзейнасці старавераў заходняга Падзвіння ўтрымліваецца ў кнізе Г. Посаха «Відзы» (1895) [18]. Цікавыя звесткі апублікаваны ў невялікай кнізе І.Д. Гарбачэўскага «Лепельскі павет Віцебскай губерні» (1895) [19]. Інфармацыя пра старавераў павета змяшчаецца ў сёмым раздзеле «Народанасельніцтва». Аўтар даволі сцісла ахарактарызаваў асаблівасці рассялення і маральныя рысы, прадставіў статыстычныя даныя, а таксама коратка спыніўся на ўзаемаадносінах з беларускім насельніцтвам Лепельскага павета. З іншых агульнаэтнаграфічных прац заслугоўвае ўвагі кніга К.Ц. Анікіевіча «Сенненскі павет Магілёўскай губерні» (1907) [20], дзе аўтар спрабуе даць усебаковую характарыстыку Сенненшчыны – гістарычную, геаграфічную, эканамічную і этнаграфічную. Этнаграфічны матэрыял змешчаны ў трэцім раздзеле кнігі. Прыведзены звесткі аб колькасці старавераў у павеце, дадзена апісанне іх жылля і ахарактарызаваны гаспадарчыя заняткі.

Некаторыя асаблівасці культуры старавераў знайшлі адлюстраванне ў абагульняючых этнаграфічных працах канца XIX – пачатку XX стст., прысвечаных паўночнабеларускаму рэгіёну. Так, шэраг матэрыялаў аб традыцыйнай культуры старавераў Віцебшчыны апублікаваў этнограф М.Я. Нікіфароўскі. Ён ахарактарызаваў некаторыя асаблівасці матэрыяльнай культуры старавераў, іх маральныя рысы, узаемаадносіны з мясцовым насельніцтвам [21 – 23]. Вядомы беларускі даследчык Е.Р. Раманаў прадставіў кароткую этнаграфічную характарыстыку старавераў Віцебшчыны ў артыкуле «Агульны нарыс Віцебскай губерні» (1898) [24]. Навуковец таксама апублікаваў некалькі вершаў старавераў Віцебска ў сваёй працы «З старaверскай літаратуры» [25], якая была апублікавана ў 1901 г. у «Магілёўскай старыне».

Грунтоўным даследаваннем аб сацыяльна-эканамічным становішчы старавераў Ковенскай губерні ў другой палове XIX – пачатку XX ст. з'яўляецца праца А.А. Станкевіча «Нарыс узнікнення рускіх пасяленняў на Літве» (1909) [26]. Для падрыхтоўкі даследавання былі выкарыстаныя як апублікаваныя раней выданні (працы В. Волкава [10], А.М. Семянтоўскага [11], П.І. Карэцкага [14]), так і вялікі аб'ём архіўных матэрыялаў. Асноўная ўвага адведзена характарыстыцы прававога і эканамічнага становішча стараверaў рэгіёна пасля паўстання 1863 г., а таксама мерапрыемстваў урада па каланізацыі краю рускімі перасяленцамі, у т.л. і стараверамі. Акрамя таго, у працы разгледжана гісторыя з'яўлення стараверaў на гэтых землях, ахарактарызаваны асаблівасці рассялення, гаспадарчыя заняткі, узаемаадносіны з уладамі і мясцовым насельніцтвам.

**Працы міжваеннага перыяда.** Новы этап у вывучэнні стараверaў на беларускіх землях прыходзіцца на міжваенны перыяд. Паколькі тэрыторыя Беларусі ў гэты час была падзелена на часткі і знаходзілася ў складзе розных дзяржаў – Польшчы і БССР, то даследаванне стараверства адбывалася як з боку савецкай гістарычнай навукі, так і з боку польскамоўных вучоных. Гістарыяграфія расколу і стараверства савецкага перыяду ўпісваюцца ў тагачасную агульную канву вывучэння гісторыі рэлігіі і царквы. Звязана гэта з тым, што з прычыны падпарадкаванасці цвёрдым ідэалагічным рамкам прадметам навуковага даследавання станавіліся строга вызначаныя пытанні. Трапляючы ў разрад атэістычнай літаратуры, даследаванні па гісторыі стараверства ў большасці выпадкаў не маглі прэтэндаваць на аб'ектыўнасць ацэнкі [27]. У 1930 г. упершыню была выдадзеная праца М.М. Нікольскага «Гісторыя рускай царквы» [28], у якой вялікая ўвага надаецца гісторыі стараверaў на беларускіх землях. Фактычна, гэта праца з'яўляецца адзіным сур'ёзным даследаваннем міжваеннага перяду ў савецкай гістарыяграфіі аб стараверах Беларусі. Пераважная ўвага ў кнізе была ўдзелена гісторыі стараверaў паўднёва-ўсходняй часткі Беларусі. У той жа час падзвінскаму рэгіёну ў працы месца амаль не знайшлося. Некаторыя асаблівасці вясельнай абраднасці стараверaў Віцебшчыны М.М. Нікольскі ахарактарызаваў у іншай працы «Паходжанне і гісторыя беларускай вясельнай абраднасці» (1956) [29].

Актыўнае этнаграфічнае даследаванне тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая па Рыжскай мірнай дамове адыйшла ў склад Польшчы, вялася польскімі даследчыкамі. Сярод выданняў, што змяшчаюць матэрыялы па стараверству ў Заходняй Беларусі каштоўнасць уяўляе праца О. Хедэмана «Гісторыя Браслаўскага павета» [30]. Кніга была выдадзена на польскай мове ў 1930 г. у Вільні. Даволі падрабязнаму апісанню перасяленцаў з Расіі аўтар прысвяціў спецыяльны раздзел «Старaверы і яўрэі». У працы прыведзены звесткі па гісторыі з'яўлення стараверaў на Браслаўшчыне, якое даследчык памылкова адносіць да сярэдзіны XVIII ст. У кнізе прыведзены дэмаграфічныя даныя, месцы стараабраднiцкага пасялення, ахарактарызаваны іх маральныя рысы, апісаны асаблівасці побыту. Аўтар таксама звярнуў увагу на істотныя змены ў побыце і рэлігійнасці стараверaў у другой палове XIX ст., разгледзеў працэсы эвалюцыі абрадавай культуры, а таксама спецыфіку ўзаемаадносін з мясцовай уладай і насельніцтвам.

У 1938 г. беларускі даследчык М. Пецюкевіч у Віленскім універсітэце абараніў магістарскую працу «Прымітыўныя рысы ў народнай культуры стараабраднікаў Браслаўскага павета» [31]. Даследаванне не было апублікавана і захоўваецца ў архіве Этнаграфічнага музея ў Торуні (Польшча). Асновай для працы сталі палявыя этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя даследчыкам у 1930-я гг. ва ўсходняй частцы Браслаўскага павета. У працы разгледжана матэрыяльная культура старaверскага насельніцтва гэтых тэрыторый. М. Пецюкевіч, арыентуючыся на працу вядомага польскага даследчыка міжваеннага перыяду К. Машыньскага «Народная культура славян», імкнуўся вызначыць у матэрыяльнай культуры стараверaў «найпрыметыўнейшыя» рысы. Даследчык прадставіў кароткую характарыстыку рассялення стараверaў на Браслаўшчыне, апісаў гаспадарчыя заняткі, традыцыі харчавання, адзенне, інтэр'ер старaверскай хаты і мэблю, начынне, транспартныя сродкі, гігіенічныя прыёмы. Асноўную частку працы займае апісанне гаспадарчых заняткаў, рамёстваў і промыслаў стараверaў. Так, ахарактарызаваны традыцыі земляробства, збіральніцтва, палявання, рыбалоўства, ткацтва і пляцення, апрацоўкі дрэва, кары, каменю, гліны, скур, прыгатавання змазкі і клею, фарбавання тканін. Такім чынам, у працы М. Пецюкевіч пастараўся ахарактарызаваць увесь комплекс матэрыяльнай культуры стараверaў. Не ахопленымі засталіся жывёлагадоўля і народнае дойлідства (сам аўтар указваў на такую акалічнасць). Да цяперашняга часу ў беларускім народазнаўстве дадзеная праца пакуль не ўвайшла ў шырокі навуковы зварот.

**Вывучэнне стараверскага насельніцтва ў 1950 – 1980-х гг.** У пасляваенны перыяд у беларускай гістарыяграфіі не было спецыяльных даследаванняў, прысвечаных стараверскаму насельніцтву. У той жа час у 1950 – 1980-х гг. быў апублікаваны шэраг прац па гісторыі і культуры старавераў на літоўскіх і латвійскіх землях. Некаторыя з гэтых даследаванняў закраналі і стараввераў Паўночнай Беларусі. У гэты перыяд вывучэннем стараввераў Латвіі займаліся А.А. Заварына [32], А.А. Падмазаў [33 – 34], Т.С. Макашына [35]. Стараввераў Літвы вывучалі В.М. Немчанка [36] і М.К. Сівіцкене [37]. Цікавасць да вывучэння гісторыі і культуры стараввераў Паўночнай Беларусі з боку даследчыкаў стараверства ў Літве і Латвіі не была выпадковай. У першую чаргу, яна была абумоўлена агульнасцю лёсаў стараверскага насельніцтва Літвы, Латвіі і Беларусі. Паколькі адзін з асноўных арэалаў пасялення стараввераў ва Усходняй Еўропе лакалізуецца якраз на беларуска-літоўска-латвійскім памежжы, то геаграфічныя рамкі даследаванняў часта выходзілі за межы кожнай з краін.

Сярод усіх работ дадзенага перыяду вылучаюцца даследаванні А.А. Заварынай. У 1956 г. яна абараніла дысертацыю на тэму «Сям'я і сямейны побыт рускага старажыльчаскага насельніцтва Латгаліі ў 2-й палове XIX – пачатку XX ст.». А ў 1986 г. была апублікавана манаграфія «Рускае насельніцтва ўсходняй Латвіі у другой палове XIX – пачатку XX ст.» [32], дзе А.А. Заварына вельмі падрабязна разгледзела гісторыю і матэрыяльную культуру стараввераў Рэжыцкага, Люцынскага і Дзісенскага паветаў Віцебскай губерні. Разам з латгальскімі матэрыяламі даследчыца прааналізавала і матэрыялы з Паўночнай Беларусі. Пры вывучэнні фарміравання рускага стараверскага насельніцтва ва ўсходняй Латвіі даследчыца вызначыла асноўныя накірункі перасялення стараввераў (у якасці аднаго з месцаў кампактнага пасялення вызначыла тэрыторыю ў раёне Друя – Браслаў – Мёры), вылучыла асноўныя этапы пасялення стараввераў на землях Латгаліі і Паўночнай Беларусі ў XVII – пачатку XX ст., ахарактарызавала першапачатковыя рэгіёны пасялення стараввераў, у т.л. і на падзвінскіх землях. Разглядаючы гаспадарчую спецыфіку стараверскага насельніцтва Латгаліі (земляробства, прылады працы, жывёлагадоўлю), даследчыца шмат увагі ўдзяліла характарыстыцы стараверскага насельніцтва ўсёй Віцебскай губерні. У той жа час, пры аналізе жылля, адзення і традыцыйнай кухні А.А. Заварына матэрыялы пра стараввераў з сучасных беларускіх земляў амаль не выкарыстоўвала. Трэба адзначыць, што пры характарыстыцы сельскагаспадарчай спецыфікі і традыцыйнага дойлідства даследчыца нярэдка робіць агульную характарыстыку латгальскага рэгіёна, а не выключна яго стараверскага насельніцтва. У сваю чаргу, Латгалія хоць і з'яўляецца месцам кампактнага пражывання стараввераў, але ўтрымлівае ў структуры насельніцтва значную долю латышоў і беларусаў. Таму некаторыя высновы аўтара адносна асаблівасцей матэрыяльнай культуры падаюцца неаргументаванымі і не тычацца выключна стараверскага насельніцтва.

У беларускай гуманітарыстыцы да пачатку 1990-х гг. амаль адсутнічалі спецыяльныя працы па гісторыі і культуры стараввераў Паўночнай Беларусі (як і стараввераў краіны ў цэлым). Бадай адзінай працай, якая была апублікавана да канца 1980-х гг., быў артыкул П.У. Церашковіча «Старавверы» [38] ў энцыклапедыі «Этнаграфія Беларусі». Даследчык вельмі коратка прадставіў гісторыю стараввераў на беларускіх землях, апісаў матэрыяльную і духоўную культуру, прадставіў характарысыку міжэтнічнага ўзаемадзеяння з беларускім насельніцтвам. Пры гэтым П.У. Церашковіч слушна адзначыў, што «з этнаграфічнага пункту гледжання старавверы на Беларусі вывучаны недастаткова» [38, с. 475].

**Гістарыяграфія аб стараверах Паўночнай Беларусі ў 1990 – 2000-х гг.** Пачынаючы з 1990-х гг. даследаванні гісторыі і культуры стараверства на беларускіх землях істотна актывізаваліся. Першай манаграфіяй па гісторыі стараабрадніцтва на Беларусі стала праца Т.П. Кароткай, К.С. Пракошынай і Г.А. Чуднікавай «Стараабрадніцтва ў Беларусі» (1992) [39]. Аўтары не ставілі мэтай даследаванне гісторыі стараввераў на беларускіх землях, а засяродзілі асноўную ўвагу на рэлігійна-філасофскіх асновах іх вучэння і становішчы стараабраднікаў на сучасным этапе. Таму ў працы падстаўлены пераважна разгляд стараверства як рэлігійнай сістэмы, пра што адначалі і самі аўтары [39, с. 4]. У працы коратка разгледжана гісторыя стараверства на беларускіх землях, але прадстаўлена амаль выключна Веткай і яе акругай, у той час, як гісторыі стараабраднікаў Паўночнай Беларусі ўвага не ўдзелена. У самой працы звесткі аб стараверах Віцебшчыны нешматлікія. Матэрыялы з Паўночнай Беларусі выкарыстаны толькі для ілюстрацыі сучасных працэсаў (на перыяд 1980-х гг.) сярод стараввераў Беларусі. Пры гэтым не заўсёды зразумела геаграфічнае аднясенне выкарыстаных матэрыялаў, паколькі ў працы гэта ніяк не пазначана.

Асабліва плённымі ў 1990 – 2000-я гг. сталі лінгвістычныя даследаванні стараверскіх гаворак Падзвіння. Важнае месца ў такіх працах займаюць супрацоўнікі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, сярод якіх ключавая роля належыць Н.Я. Мінінай. У 1993 г. яна абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму «Фанетыка-граматычныя асаблівасці трох астраўных рускіх гаворак на тэрыторыі Віцебскай вобласці» [40]. На аснове матэрыялаў, зафіксаваных у ходзе дыялекталагічных экспедыцый, даследчыцай былі выяўлены фанетычныя і граматычныя асаблівасці стараверскіх гаворак Чашніцкага раёна. Асабліва важнымі з'яўляюцца высновы Н.Я. Мінінай аб тым, што рускія гаворкі Чашніцкага раёна збліжаюцца з усходнімі і паўночна-ўсходнімі пскоўскімі гаворкамі і генетычна звязаныя з рускімі гаворкамі Прыбалтыкі і Польшчы. Такія высновы дапаўняюць гістарычныя звесткі ў пытаннях пахо-

джання старавераў Паўночнай Беларусі і сумежных прыбалтыйскіх тэрыторый. У іншых працах Н.Я. Мінінай, апублікаваных у 1990 – 2000-х гг., шырока прадстаўлена лінгвістычная (дыялекталагічная) характарыстыка стараверскага насельніцтва Паўночнай Беларусі [41 – 49]. Своеасаблівым падсумаваннем даследаванняў Н.Я. Мінінай стала яе манаграфія «Астраўныя рускія гаворкі Віцебшчыны» (2003) [50]. У працы прадстаўлена даследаванне фанетычных, граматычных і лексічных асаблівасцей стараверскіх гаворак Віцебшчыны. Значную частку працы складаюць матэрыялы для слоўніка рускіх гаворак [50, с. 66–147].

Іншыя даследчыкі з Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 1990 – 2000-я гг. таксама зрабілі нямала ў вывучэнні асаблівасцей стараверскай лексікі. Так, даследаванне антрапаніміі астраўной гаворкі стараверaў (на тэрыторыі Мёрскага раёна) прадстаўлена ў дысертацыі і публікацыях А.Ю. Мурaтавай [51 – 53]. І.Я. Кураш разгледзела імянную сістэму стараверaў Віцебшчыны [54 – 56]. Назвы стараверскіх культавых пабудоў рэгіёна прааналізаваны В.А. Лукіной [57].

Важнай вехай у даследаванні канфесійнага становішча на Беларусі стала выданне ў 1998 г. калектыўнай манаграфі «Канфесіі на Беларусі» (канец XVIII – XX ст.) [58]. У працы ўпершыню ў айчыннай навуцы была комплексна і грунтоўна асветлена гісторыя стараверaў на беларускіх землях у канцы XVIII – пачатку XX ст. У ёй прадстаўлены і матэрыялы аб стараверах Паўночнай Беларусі. Так, А.М. Філатава прывяла звесткі аб асаблівасцях рассялення і колькасці стараверaў на паўночнабеларускіх землях, ахарактарызавала адносіны паміж праваслаўным духавенствам і стараверамі Віцебшчыны ў сярэдзіне XIX ст. Даследчыца В.В. Грыгор'ева прааналізавала дзяржаўную палітыку ў адносінах стараверaў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Яна разгледзела і гісторыю стараверaў Паўночнай Беларусі. Так, была прыведзена характарыстыка асаблівасцей рассялення стараверскага насельніцтва і статыстычныя даныя. На аснове афіцыйных даных па Віцебскай і Віленскай губернях даследчыца разгледзела пытанні пераходу стараверaў у праваслаўную царкву, ахарактарызала адносіны да праваслаўнага духавенства, улад і мясцовага беларускага насельніцтва.

Істотная роля ў вывучэнні стараверства на Беларусі належыць А.А. Гарбацкаму. Ён з'яўляецца аўтарам двух манаграфій [3; 59] і шэрагу артыкулаў [1; 60 – 64; 111 – 112] па гісторыі і культуры стараверaў на беларускіх землях. Манаграфія «Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX ст.» (1999) [3] з'яўляецца першай спробай усебаковага асвятлення гісторыі і культуры прышлага насельніцтва. У якасці крыніц для даследавання былі выкарыстаны шырокі комплекс архіўных матэрыялаў, апублікаваных пісьмовых крыніц, статыстычных даных. Акрамя таго, даследчык правёў і шэраг экспедыцый, у тым ліку на поўначы Беларусі (у Браслаўскім і Шаркаўшчынскім раёнах). У працы дадзена характарыстыка засялення паўночнабеларускіх зямель стараверамі (указаны прычыны іх перасялення на беларускія землі, выяўлены месцы першапачатковага засялення рэгіёна, вызначаны рэгіёны, з якіх перасяліся староверы). Даследчык выявіў два арэалы пасялення стараверaў-беспапоўцаў на тэрыторыі Падзвіння (першы – на захадзе рэгіёна, другі – у цэнтральнай і ўсходняй частках). У манаграфіі А.А. Гарбацкі апісаў некаторыя падзеі ранняй гісторыі стараверaў у першай палове XVIII ст. Пры гэтым трэба адзначыць, што ў працы вельмі сцісла разгледжана гісторыя стараверaў на паўночнабеларускіх землях у другой палове XVII – XVIII стст. З гэтай прычыны ў працы нельга адшукаць поўнай характарыстыкі працэсаў засялення стараабрадцамі паўночна-беларускіх земель. Найбольш увагі адведзена характарыстыцы гісторыі стараверства на беларускіх землях у XIX – пачатку XX ст. Асноўны вектар разгляду – дзяржаўная палітыка расійскіх улад у дачыненні да стараверскага насельніцтва. У сувязі з аналізам гэтай праблематыкі аўтар выкарыстоўвае матэрыялы з Віцебскай і Віленскай губерняў, а таксама Новааляксандраўскага павета Ковенскай губерні. Даследчык аналізуе таксама колькасць стараверскага насельнітва на працягу XIX – пачатку XX стст., (з паўночнабеларускіх тэрыторый гэта пераважна тычыцца Віцебскай губерні). У кнізе прыведзены звесткі аб сацыяльна-эканамічным становішчы віцебскіх стараверaў у азначаны перыяд, колькасці культавых пабудоў у рэгіёнах у розныя перыяды. Разам з разглядам гісторыі стараверaў, А.А. Гарбацкі дае кароткую характарыстыку іх гаспадарчых заняткаў (земляробства, рамяство, гандаль, промыслы), характарызуе асаблівасці планіроўкі некаторых стараверскіх пасяленняў Віцебшчыны, выяўляе агульныя рысы народнага дойлідства, планіроўкі сядзібы і інтэр'ера стараверскага дома. Пры гэтым спецыфіку народнага стараверскага адзення і дойлідства А.А. Гарбацкі выявіў на аснове апісанняў канца XIX ст., якія, у сваю чаргу, ілюструюць пераважна побыт багатай часткі стараверскага гарадскога насельніцтва, які ўжо ў значнай ступені эвалюцыянаваў. У працы апісана таксама ўнутраная планіроўка стараверскай малельні беспапоўцаў (на прыкладзе г. Віцебска), прыведзены звесткі аб духоўных настаўніках і вядомых стараверах Віцебшчыны. Трэба адзначыць, што ў працы з паўночнабеларускіх тэрыторый прыярытэт аддаецца характарыстыцы Віцебскай губерні, менш Новааляксандраўскаму павету і зусім мала ўвагі адводзіцца характарыстыцы стараверaў Віленскай губерні. Зразумела, агульны характар кнігі і яе аб'ём абумовілі выбар матэрыялу, але ў працы заходняя частка Падзвіння, якая і ў сучасны перыяд з'яўляецца адным з асноўных рэгіёнаў стараверства ў Беларусі, прадстаўлена зусім скупа.

Другая манаграфія А.А. Гарбацкага «Стараабраднiцтва на беларускіх землях» [59], якая была апублікавана ў 2004 г. на рускай мове, амаль цалкам паўтарае папярэднюю. Але яна ўтрымлівае шэраг

дадатковых матэрыялаў. Так, у працы змешчана апісанне каляндарных абрадаў старавераў Браслаўскага і Шаркаўшчынскага раёнаў.

У 2000-я гг. даследаванне гісторыі стараабраднікаў на беларускіх землях значна актывізавалася. Гэтай праблематыцы была прысвечана канферэнцыя «Стараабраднiцтва як гісторыка-культурны феномен», якая адбылася ў Гомелі ў 2003 г. У апублікаваным зборніку канферэнцыі былі змешчаны вынікі і матэрыялы шэрагу даследаванняў, якія прысвечаны старaверам Віцебшчыны. Так, Н.А. Бабровіч ахарактарызавала культурную спадчыну старавераў Віцебшчыны, якая захоўваецца ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі [65]. Становішча старавераў г. Віцебска адразу пасля прыняцця Указа 1905 г. «Аб умацаванні пачаткаў верацярпімасці» апісала Т.В. Дабжынская [66]. Вобраз старавера («асташа») у творах Я. Баршчэўскага раскрыў У.А. Лобач [67]. На аснове этнаграфічных матэрыялаў апошняй чвэрці XIX ст. У.С. Філіпенка прааналізаваў вясельную абраднасць старавераў-беспапоўцаў Паўночнай Беларусі [68].

У 2000-я гг. па гісторыі і культуры старавераў Паўночнай Беларусі апублікавалі шэраг даследаванняў Т.В. Трафімава (Дабжынская) і У. Іваноў. Працы Т.В. Трафімавай ў асноўным прысвечаны старaверам заходняга Падзвіння. Так, у артыкуле «Духоўныя стараабрадніцкія настаўнікі на Віцебшчыне ў першай палове XX ст.» [69] апісана жыццё і дзейнасць трох вядомых старaверскіх дзеячаў заходняга Падзвіння – А.М. Піманава, С.Ф. Егупёнка, М.Г. Салаўёва. Асаблівасці царкоўнага спеву падчас набажэнстваў у старавераў Браслаўшчыны разгледжаны даследчыцай у артыкуле «Гісторыя крукавага спеву і яго месца ў набажэнствах стараабраднікаў Віцебшчыны» [70]. На аснове матэрыялаў палявых этнаграфічных даследаванняў Т.В. Трафімава ахарактарызавала асаблівасці традыцыйнага старaверскага адзення заходняй часткі Віцебскай вобласці ў артыкуле «Асаблівасці адзення стараабрадцаў Віцебшчыны ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя» [71]. Шэраг работ даследчыцы прысвечаны традыцыйнай духоўнай культуры старавераў Віцебшчыны [72 – 74]. Трэба адзначыць, што значная частка артыкулаў Т.В. Трафімавай у сваёй назве ўказвае на ўсю Віцебшчыну канца XIX – пачатку XX стст, але ў працах прадстаўлена характарыстыка толькі заходняй часткі рэгіёна, прычым на аснове ўспамінаў рэспандэнтаў, самыя старыя з якіх нарадзіліся толькі ў 1920-я гг. Пры гэтым высновы аўтар спрабуе «пашырыць» ужо на ўвесь рэгіён і на перыяд з канца XIX да пачатку XX ст.

Даследаванні У. Іванова [75 – 78] прысвечаны традыцыйнай культуры старавераў рэгіёну, асаблівасцям іх узаемадзеяння з мясцовым насельніцтвам, уплыву беларусаў на культуру старавераў, эвалюцыі ідэнтычнасці апошніх, зменам у іх культавай сферы цягам XX – пачатку XXI ст. У працах шырока выкарыстаны матэрыялы ўласных палявых даследаванняў, праведзеных пераважна ва ўсходняй частцы Падзвіння.

У 2016 г. была апублікавана кніга А.А. Сухарава «Беларусь Паўночная» [79], у якой разгледжана гісторыя старaверскага роду Красікавых. Выданне ўтрымлівае асобную частку, прысвечаную агульнай характарыстыцы гісторыі і культуры старавераў Падзвіння. Яна не мае арыгінальнага характара і ўяўляе кампіляцыю раней апублікованых даных. Пераважна ў выданні прадстаўлены вытрымкі з манаграфіі А.А. Гарбацкага [59] (пры тым, амаль без спасылак!).

Шэраг аспектаў з гісторыі і культуры старавераў Паўночнай Беларусі былі разгледжаны ў сувязі з даследаваннямі самых розных пытанняў гістарычнай и народазнаўчай праблематыкі. Так, традыцыі народнага ткацтва старавераў Віцебшчыны даследавала В.А. Лабачэўская [80 – 83]. Этнапесенныя традыцыі старавераў Паўночнай Беларусі на аснове сучасных палявых экспедыцый прааналізавала Т.Л. Канстанцінава [84]. Этнаканфесійныя стэрэатыпы ў беларускай вёсцы адносна старaверскага насельніцтва Віцебшчыны разгледжаны ў калектыўным артыкуле М.П. Антропава, А.М. Боганевай, Т.В. Валодзінай [85]. Некаторыя асаблівасці веснавой каляндарнай абраднасці старавераў заходняга Падзвіння разгледзела І. Алексніна [86]. Дзяржаўную палітыку ў адносінах старавераў Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стст. прааналізаваў В.В. Табуноў [88]. Некаторыя факты з грамадскага і рэлігійнага жыцця старавераў Віцебшчыны прыведзены ў працы І.А. Пушкіна [87, с. 228–229, 298]. Грамадскае і культурна-асветніцкае жыццё старавераў Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы ў 1920 – 1930-я гг. прааналізаваў А.М. Вабішчэвіч [89]. Гісторыю старавераў Беларусі канца XVII – XVIII стст. асвятляў у дысертацыйным даследаванні С.А. Захаркевіч [90]. Сучасную структуру старaверскай царквы на Віцебшчыне ахарактарызаваў В.У. Старасценка [91 – 92]. Міжканфесійныя адносіны на тэрыторыі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. разгледзеў В. Лінкевіч [93]. Тапанімію Беларусі, звязаную са старaверамі, апісаў А.Ф. Рогалеў [94]. Палеаграфічныя асаблівасці старaверскіх рукапісных і старадрукаваных пеўчых кніг, якія захоўваюцца ў Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку, выявіла Н.І. Дожына [95]. Праўвое становішча старавераў Паўночнай Беларусі напярэдадні і пасля паўстання 1863 г. разгледзеў А.Ю. Бендзін [96].

Некаторыя матэрыялы па культуры старавераў былі апублікаваны ў выданні «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Т. 2: Віцебскае Падзвінне» (2004). Кніга змяшчае звесткі, якія характарызуюць асаблівасці ўспрыняцця старавераў мясцовым беларускім насельніцтвам рэгіёна [97, с. 782–783, 788–789], некаторыя рысы каляндарнай абраднасці старавераў [97, с. 72]. Найбольш поўна прадстаўлена

характарыстыка народнага ткацтва старавераў Паўночнай Беларусі (пераважна, стараверскіх ручнікоў) [97, с. 844 – 847, 862 – 866].

Некаторыя аспекты гісторыі і культуры старавераў Паўночнай Беларусі разгледжаны ў выданнях і працах супрацоўнікаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Так, В.Ф. Бацяеў у гістарыяграфічным артыкуле ахарактарызаваў некаторыя працы, у якіх разглядалася матэрыяльная культура рускіх у Беларусі [98]. Аднак, што тычыцца старавераў Беларусі, то аўтар разгледзеў толькі два артыкулы з энцыклапедыі «Этнаграфія Беларусі» (1989). Даследчыца Г.І. Каспяровіч ахарактарызавала гаспадарчыя заняткі рускіх (у т.л. і старавераў) на беларускіх землях у канцы XIX – XX стст. Аднак матэрыялы аб стараверах Паўночнай Беларусі ў артыкуле амаль не выкарыстаны [99]. Асобныя пытанні аб стараверах Падзвіння разгледжаны ў навукова-папулярным выданні «Хто жыве ў Беларусі» (2012) [100], якое было падрыхтавана супрацоўнікамі Цэнтра. У раздзеле «Рускія», аўтарам якога з'яўляецца Г.І. Каспяровіч, асвятляецца гісторыя і традыцыйная культура старавераў Беларусі. Разгледжаны іх дэмаграфічныя змены ў XIX – пачатку XX ст. і асаблівасці рассялення, некаторыя рысы матэрыяльнай культуры (гаспадарчыя заняткі, планіроўка паселішчаў, народная кулінарыя, традыцыйнае адзенне) і сямейнай абраднасці. Пры гэтым трэба адзначыць, што ў выданні старaверы часта не выдзяляюцца з агульнай рускай этнічнай групы ў Беларусі. А таму з агульнай характарыстыкі рускіх не заўсёды вылучаюцца матэрыялы аб стараверах. Да таго ж, у выданні пераважна гаворка вядзецца пра старавераў Падняпроўя, у той час як падзвінскім стараверам увагі ўдзелена мала. У іншым навукова-папулярным выданні Цэнтра «Этнічныя традыцыі нацыянальнай кухні Беларусі» (2019) [101] змешчаны матэрыялы аб традыцыях харчавання старавераў Беларусі. Аднак неабходна адзначыць, што традыцыйная кухня старавераў Паўночнай Беларусі ахарактарызавана вельмі павярхоўна. Асноўнай крыніцай для такой характарыстыкі стала краязнаўчая работа школьнікаў аб традыцыі стараверскіх вёсак Буеўшчына і Калеснікі Браслаўскага раёна. У той жа час, у выданні не выкарыстаны нават асноўны комплекс апублікаваных крыніц па дадзенай праблематыцы.

У сучасны перыяд падрыхтаваны шэраг работ маладых беларускіх даследчыкаў аб стараверах Паўночнай Беларусі. Так, І.У. Магалінскім апублікаваны некалькі артыкулаў [102 – 103], прысвечаных дзяржаўнай палітыцы ў дачыненні старавераў Віцебшчыны ў XIX – пачатку XX ст. А ў Вілюнюскім педагагічным універсітэце А. Адамковіч падрыхтаваў магістарскую дысертацыю аб стараверах Шаркаўшчынскага раёна Віцебскай вобласці [104].

У 1990 – 2000-я гг. апублікаваны шэраг работ па гісторыі і культуры старавераў асобных населеных пунктаў ці раёнаў. Аўтарамі гэтых прац з'яўляюцца як прафесійныя навукоўцы, так і мясцовыя краязнаўцы. Так, інфармацыя аб стараверах Браслаўшчыны ўтрымліваецца у артыкулах К. Шыдлоўскага [105 – 106], публікацыях па выніках працы канферэнцыі «Браслаўскія чытанні» [107 – 110], кнізе «Памяць» Браслаўскага раёна [111]. Некаторыя аспекты гісторыі і культуры старавераў Пастаўшчыны змешчаны ў працах І. Пракаповіча [112], І. Будзько [113].

Шэраг даследаванняў па гісторыі і культуры старавераў Паўночнай Беларусі былі падрыхтаваны і аўтарам дадзенага артыкула [114 – 129].

Важную ролю ў даследаванні гісторыі і культуры старавераў Паўночнай Беларусі ў 1990 – 2000-х гг. адыгралі літоўскія вучоныя В.М. Чэкманас, Г.У. Паташанка, Н.А. Марозава, Ю.А. Новікаў.

